## АЛЯКСАНДР АЛЯКСАНДРАВІЧ ЛУКАШАНЕЦ

**(Да 60-годдзя з дня нараджэння)**



Валожынская зямля шчодрая на таленавітых людзей. Сярод яе ўраджэнцаў ёсць сусветнавядомыя грамадскія дзеячы, вучоныя, пісьменнікі, паэты, музыканты, архітэктары, медыкі і святары. Далёка за межамі Беларусі вядома і імя выдатнага вучонага-мовазнаўца, таленавітага педагога і арганізатара беларускай лінгвістычнай навукі – Аляксандра Аляксандравіча Лукашанца – першага намесніка дырэктара Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі (дырэктара філіяла «Інстытут мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы»), доктара філалагічных навук, члена-карэспандэнта Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, прафесара.

А. А. Лукашанец нарадзіўся 23 лістапада 1954 года ў вёсцы Жураўцы Валожынскага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і. Рана застаўшыся без бацькі, Аляксандр Аляксандравіч узяў на сябе ўсе клопаты па гаспадарцы. Праца загартавала юнака, сфарміравала ў яго волю, адказнасць, навучыла з аптымізмам глядзець на жыццёвыя цяжкасці. Мілагучная мясцовая гаворка землякоў, любоў да слова, перададзеная яшчэ на генетычным узроўні, падтрыманая мудрымі дзедам і бабуляй, а таксама бацькамі, прывітая настаўнікамі, абумовілі выбар прафесіі. Пасля заканчэння Сакаўшчынскай сярэдняй школы А. А. Лукашанец паступіў на філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, які з адзнакай закончыў у 1977 годзе. У гэтым жа годзе ён быў залічаны на працу ў Інстытут мовазнаўства імя Якуба Коласа АН БССР спачатку на пасаду стажора-даследчыка, затым – малодшага навуковага супрацоўніка. У 1978 годзе як адзін з лепшых маладых і перспектыўных навукоўцаў быў накіраваны ў Маскву для навучання ў аспірантуры Інстытута рускай мовы АН СССР. Навуковым кіраўніком аспіранта стаў вядомы вучоны, выдатны спецыяліст у галіне рускай дэрываталогіі, прафесар А. М. Ціханаў, які аказаў вялікі ўплыў на фарміраванне навуковых інтарэсаў Аляксандра Аляксандравіча. З маскоўскім перыядам у біяграфіі А. А. Лукашанца звязаны пачатак даследаванняў актуальных і малавывучаных праблем беларускага і славянскага словаўтварэння. Вынікам навучання ў аспірантуры стала паспяховая абарона ў 1981 годзе кандыдацкай дысертацыі на тэму «Словаўтваральныя гнёзды дзеясловаў у рускай і беларускай мовах».

З лютага 1982 года працоўная дзейнасць А. А. Лукашанца непарыўна звязана з Інстытутам мовазнаўства імя Якуба Коласа. Навуковыя і арганізатарскія здольнасці маладога даследчыка мовы былі заўважаны кіраўніцтвам Акадэміі навук. У 1986 года ён быў прызначаны на адказную пасаду вучонага сакратара Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа. А ў 1989 годзе пастановай Прэзідыума АН БССР А. А. Лукашанец быў зацверджаны на пасадзе намесніка дырэктара па навуковай рабоце гэтай установы. У 1997 годзе ў выніку конкурсу абраны на пасаду загадчыка аддзела беларуска-рускіх моўных сувязей на грамадскіх пачатках.

За час работы на адказных пасадах загадчыка аддзела, вучонага сакратара і намесніка дырэктара А. А. Лукашанец выявіў свае арганізатарскія і прафесійныя якасці: з аднаго боку, ён зарэкамендаваў сябе як ініцыятыўны, энергічны, прынцыповы, самастойны кіраўнік, а з другога боку – пастаянны творчы пошук у навуковай сферы і выключная працаздольнасць таксама далі свой плён. У 2001 годзе А. А. Лукашанец паспяхова абараніў доктарскую дысертацыю «Граматычныя аспекты беларускага словаўтварэння». У гэтай рабоце, манаграфіі «Словаўтварэнне і граматыка»

і іншых публікацыях юбіляра ўпершыню ў беларускім мовазнаўстве на аснове распрацаванай аўтарам іерархіі адзінак словаўтварэння і іх узроўневай інтэрпрэтацыі пабудавана мадэль граматычнага даследавання сістэмы словаўтварэння беларускай мовы і практычнае апісанне суфіксальнага словаўтварэння назоўнікаў з пазіцый граматычных катэгорый, што сведчыць аб стварэнні новага навуковага напрамку ў беларускім мовазнаўстве. У 2002 годзе пастановай Прэзідыума Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Рэспублікі Беларусь А. А. Лукашанцу прысвоена вучонае званне «прафесар» па спецыяльнасці «Мовазнаўства».

У 2004 годзе Аляксандр Аляксандравіч Лукашанец быў прызначаны дырэктарам Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа НАН Беларусі, у 2008 годзе – дырэктарам аб'яднанага Інстытута мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы НАН Беларусі, а з 2012 года з'яўляецца першым намеснікам дырэктара Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі.

Дыяпазон навуковых даследаванняў А. А. Лукашанца надзвычай шырокі: беларускае і славянскае словаўтварэнне, лексікалогія і лексікаграфія, сацыялінгвістыка, анамастыка, правапіс, праблемы сучаснага развіцця і функцыянавання беларускай мовы.

У цэнтры яго навуковых інтарэсаў знаходзіцца беларускае і славянскае словаўтварэнне. Гэтай навуковай праблеме прысвечаны кандыдацкая і доктарская дысертацыі, манаграфіі «Словаўтварэнне і граматыка», «Праблемы сучаснага беларускага словаўтварэння» (2013), даклад на XII Міжнародным з'ездзе славістаў (Кракаў, 1998) «Граматычны аспект славянскага словаўтварэння», шматлікія артыкулы, апублікаваныя ў айчынных і замежных выданнях. А. А. Лукашанец выступаў з дакладамі па словаўтваральнай праблематыцы на міжнародных навуковых канферэнцыях па славянскім словаўтварэнні ў Польшчы, Германіі, Аўстрыі, Славакіі, Балгарыі, Сербіі, Расіі, Украіне.

Другі важны напрамак навуковых інтарэсаў А. А. Лукашанца – гэта праблемы білінгвізму і ўзаемадзеяння моў, сацыялінгвістыка і культура рускай мовы ў Беларусі. Удзельнічаў у выкананні некалькіх навуковых праектаў і з'яўляецца суаўтарам манаграфій «Руская мова ў Беларусі» (Мн., 1985), «Супастаўляльнае апісанне рускай і беларускай моў. Марфалогія» (Мн., 1990), «Тыпалогія двухмоўя і шматмоўя ў Беларусі» (Мн., 1999), кнігі «Мова – палітыка – грамадства» (Мн., 1988), дапаможніка «Культура рускага маўлення ў пытаннях і адказах» (Мн., 1995).

А. А. Лукашанец шмат увагі ўдзяляе даследаванню праблем развіцця і функцыянавання беларускай мовы ў ХХ – пачатку XXI ст., стану яе сучасных норм, асаблівасцям узаемадзеяння з суседнімі рускай і польскай мовамі. Ён удзельнічаў у выкананні двух буйных міжнародных славістычных праектаў і з'яўляецца суаўтарам дзвюх калектыўных манаграфій «Najnowsze dzieje języków słowiańskich. Беларуская мова» (Opole, 1998; суаўтар і сурэдактар), «Komparacja współczesnych języków słowiańskich. Słowotwórstwo. Nominacja» (Opole, 2003). Гэтай жа праблематыцы прысвечаны яго даклады на XIII (Славенія, 2003) і XIV (Македонія, 2008) Міжнародных з'ездах славістаў: «Сучасныя працэсы ў словаўтварэнні беларускай мовы: Да праблемы міжмоўнага збліжэння і адштурхоўвання», «Да праблемы міжмоўнага славянскага ўзаемадзеяння. Беларуская мова паміж польскай і рускай». У гэтых і іншых працах асаблівасці развіцця слоўнікавага складу беларускай мовы, фарміраванне яе літаратурных норм разглядаюцца з пазіцый збліжэння з суседнімі блізкароднаснымі мовамі (рускай і польскай) і адштурхоўвання ад іх. А. А. Лукашанцам упершыню ў славянскім мовазнаўстве распрацавана арыгінальная канцэпцыя ацэнкі сучасных інавацыйных працэсаў, што адбываюцца ў лексіцы і словаўтварэнні ўсходнеславянскіх моў у рамках тэндэнцый да інтэрнацыяналізацыі і нацыяналізацыі паводле крытэрыяў накіраванасці інавацыйных працэсаў, іх аб'ектыўнасці/суб'ектыўнасці, кантралюемасці/некантралюемасці, часавай аднесенасці (перспектыўнасці/рэтраспектыўнасці), ацэнкі моўных з'яў (пазітыўнасці/негатыўнасці), адрасатнасці і адносін да сістэмы мовы. Увядзенню беларускай мовы ў сучасны еўрапейскі лінгвістычны кантэкст спрыяў таксама ўдзел А. А. Лукашанца ў выкананні міжнароднага праекта, прысвечанага апісанню словаўтваральных сістэм усіх еўрапейскіх моў, у рамках якога вучоны падрыхтаваў нарыс па беларускім словаўтварэнні (на англійскай мове) для двухтомнай манаграфіі, якая пабачыць свет у 2015 годзе.

Цыкл публікацый А. А. Лукашанца (напрыклад, артыкулы «Моўныя праблемы жыцця сучаснага беларускага грамадства», «Беларуская нацыянальная мова на сучасным этапе: сістэма, статус,

функцыянаванне», «Дзяржаўнае двухмоўе: сутнасць і праблемы рэалізацыі», «Беларуская мова ва ўмовах блізкароднаснага беларуска-рускага білінгвізму: парадоксы развіцця сістэмы, функцыянавання і моўнай свядомасці», «The Belarussian language in the communicative space of present-day Belarus», «Моўная сітуацыя ў Беларусі: праблема нацыянальнай ідэнтыфікацыі ў сучасным еўрапейскім кантэксце», «La langue biélorusse et les etudes biélorusses: état et perspectives» і інш.) прысвечаны даследаванню сучаснага стану беларускай мовы, яе прававога статусу і месца ў камунікатыўнай, культурнай і інфармацыйнай прасторы беларускага грамадства, праблемам і асаблівасцям развіцця сістэмы беларускай мовы на сучасным этапе.

А. А. Лукашанец з'яўляецца адным з актыўных распрацоўшчыкаў Закона Рэспублікі Беларусь «Аб правілах беларускай арфаграфіі і пунктуацыі» (прыняты 23 ліпеня 2008 г., уведзены ў дзеянне 01.09.2010 г.). Сваёй прынцыповай і паслядоўнай навуковай пазіцыяй у значнай ступені садзейнічаў захаванню традыцый пераемнасці пісьмовай беларускай мовы, а таксама стабілізацыі і ўніфікацыі правапісных норм, што мае выключна важнае значэнне для сферы школьнага навучання. Пры непасрэдным удзеле і пад кіраўніцтвам А. А. Лукашанца падрыхтаваны цыкл практычных даведнікаў і слоўнікаў беларускай мовы, якія забяспечылі ўвядзенне Закона Рэспублікі Беларусь «Аб правілах беларускай арфаграфіі і пунктуацыі» ў моўную практыку і навучальны працэс. Цыкл мае інавацыйны характар і стаў першым у сучасным беларускім мовазнаўстве комплексам, у якім даецца тэарэтычнае абгрунтаванне і тлумачэнне ўнесеных у беларускі правапіс змен, а таксама забяспечваецца факталагічная база практычнага карыстання пісьмовай беларускай мовай згодна з новымі правіламі арфаграфіі. Гэты цыкл атрымаў шырокую вядомасць і запатрабаванасць, а таксама стаў базай для падрыхтоўкі іншых практычных дапаможнікаў па беларускай арфаграфіі, у тым ліку для сферы школьнага навучання.

Аляксандр Аляксандравіч унёс значны ўклад у развіццё беларускай лексікаграфіі: пры яго непасрэдным удзеле, пад яго навуковай рэдакцыяй падрыхтаваны шэраг словаўтваральных, арфаграфічных, граматычных, перакладных, анамастычных і тэрміналагічных слоўнікаў, якія шырока запатрабаваны ва ўсіх сферах грамадства – у першую чаргу ў сферы адукацыі, інфармацыі, культуры, справаводства: «Словаўтваральны слоўнік беларускай мовы» (2000), «Школьны словаўтваральны слоўнік беларускай мовы» (2006), «Основные термины метрологии. Русско-белорусский словарь-справочник» (2007), «Современный русско-белорусский словарь для школьников» (2009), «Арфаграфічны слоўнік беларускай мовы» (2009), Современный русско-белорусский словарь» (2011), «Слоўнік асабовых уласных імён» (2011), «Русско-белорусский терминологический словарь по порошковой металлургии» (2012), «Разам, асобна, праз злучок. Даведнік» (2012), «Беларуска-рускі слоўнік: у 3 тамах» (2012), «Русско-белорусский словарь: в 3 томах» (2012) і інш.

Вынікі навуковых даследаванняў А. А. Лукашанца рэгулярна публікуюцца ў навуковых выданнях у Беларусі і за мяжой, ён неаднаразова выступаў з дакладамі на навуковых канферэнцыях у Польшчы, Аўстрыі, Германіі, Іспаніі, Італіі, Расіі, Украіне, Сербіі, Славеніі, Славакіі, Македоніі. Апублікаваў больш за 250 навуковых прац (з іх больш за 30 у замежных выданнях), у тым ліку 10 манаграфій (8 у суаўтарстве, 2 за мяжой), 4 слоўнікі (у суаўтарстве), 4 вучэбныя дапаможнікі (у суаўтарстве), 2 брашуры. З'яўляецца навуковым і адказным рэдактарам (сурэдактарам) 25 навуковых прац (манаграфій, навуковых зборнікаў, слоўнікаў, вучэбных дапаможнікаў).

Вучоны актыўна прапагандуе дасягненні беларускага і акадэмічнага мовазнаўства, часта выступае ў сродках масавай інфармацыі па актуальных праблемах моўнага жыцця краіны.

Сваю навуковую работу А. А. Лукашанец эфектыўна спалучае з выкладчыцкай і навукова-арганізацыйнай дзейнасцю. На працягу многіх гадоў ён працуе па сумяшчальніцтве прафесарам кафедры сучаснай беларускай мовы філалагічнага факультэта БДУ, выкладае курс сучаснай беларускай мовы, працуе старшынёй ДЭК, кіруе падрыхтоўкай аспірантаў. Актыўна супрацоўнічае з Нацыянальным інстытутам адукацыі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, удзельнічае ў распрацоўцы праграм па беларускай мове для школ краіны, выступае экспертам па падручніках па беларускай мове для школьнікаў. А. А. Лукашанец з'яўляецца суаўтарам і сурэдактарам вучэбнага дапаможніка «Супастаўляльны аналіз усходнеславянскіх моў. Вучэбны дапаможнік для студэнтаў ВНУ» (Мн., 2005), «Пішам па-беларуску: даведнік па арфаграфіі і пунктуацыі з каментарыямі» (Мн., 2010), суаўтарам дапаможнікаў «Сучасная беларуская арфаграфія: акадэмічны

даведнік» (Мн., 2012) і інш. На працягу 2011–2013 гадоў быў старшынёй журы заключнага этапу Рэспубліканскай алімпіяды школьнікаў па беларускай мове.

Аляксандр Аляксандравіч Лукашанец з'яўляецца заснавальнікам беларускай словаўтваральнай навуковай школы: у яго навуковых працах закладзены тэарэтычныя асновы і практычныя падыходы да вывучэння словаўтваральных адносін у беларускай мове, распрацаваны метады і інструменты іх вырашэння. Навуковыя ідэі настаўніка творча развіваюць і рэалізуюць яго вучні. На сённяшні дзень пад навуковым кіраўніцтвам члена-карэспандэнта НАН Беларусі прафесара А. А. Лукашанца падрыхтавана і абаронена 15 кандыдатаў навук.

А. А. Лукашанец – старшыня савета па абароне дысертацый Д 01.42.03 пры Цэнтры даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі (з 1989 па 2002 год з'яўляўся вучоным сакратаром савета), з'яўляўся членам савета па абароне дысертацый Д 01.02.24 пры БДУ, з 2003 па 2005 год быў старшынёй экспертнага савета № 28 ВАК Беларусі, старшынёй Міжнароднага камітэта славістаў (2008–2013), зараз ён – старшыня Беларускага камітэта славістаў, старшыня Камісіі па славянскім словаўтварэнні пры Міжнародным камітэце славістаў, член падкамітэта па Дзяржаўных прэміях Рэспублікі Беларусь у галіне навукі і тэхнікі, член рэдкалегіі часопіса «Весці НАН Беларусі. Серыя гуманітарных навук», член Бюро Навукова-метадычнага савета пры Міністэрстве адукацыі Рэспублікі Беларусь, старшыня секцыі рускай мовы, рускай і замежнай літаратуры Навукова-метадычнага савета пры Міністэрстве адукацыі Рэспублікі Беларусь і інш.

На працягу апошніх адзінаццаці гадоў А. А. Лукашанец з'яўляецца членам Нацыянальнага арганізацыйнага камітэта па падрыхтоўцы і правядзенні Дзён беларускага пісьменства і займаецца арганізацыяй і правядзеннем навукова-практычных канферэнцый у Полацку, Тураве, Камянцы, Паставах, Шклове, Барысаве, Хойніках, Смаргоні, Ганцавічах, Глыбокім, Заслаўі. Дзякуючы намаганням А. А. Лукашанца гэтыя канферэнцыі сталі важнай часткай праграмы Дзён беларускага пісьменства і атрымліваюць шырокі станоўчы рэзананс у грамадскасці і сродках масавай інфармацыі.

Як вучоны сакратар і старшыня (з 2004 г.) Беларускага камітэта славістаў А. А. Лукашанец правёў вялікую арганізацыйную работу па забеспячэнні ўдзелу беларускай дэлегацыі ў XII (Кракаў, 1998), XIII (Любляна, 2003), XIV (Охрыд, 2008) і XV (Мінск, 2013) Міжнародных з'ездах славістаў. Даклады беларускіх вучоных на XIII, XIV і XV Міжнародных з'ездах славістаў выдадзены асобнымі зборнікамі. У перыяд з 2008 па 2013 год быў старшынёй Міжнароднага камітэта славістаў. Пад яго непасрэдным кіраўніцтвам упершыню ў Беларусі на высокім узроўні быў арганізаваны і праведзены XV Міжнародны з'езд славістаў, які стаў навукова-культурнай падзеяй агульнадзяржаўнага маштабу. Правядзенне гэтага форуму спрыяла павышэнню прэстыжу Рэспублікі Беларусь як незалежнай славянскай краіны, а таксама пашырэнню ведаў аб Беларусі, яе навуцы, культуры, гісторыі.

Аляксандр Аляксандравіч актыўна выступае ў сродках масавай інфармацыі па розных праблемах моўнага жыцця ў краіне, пытаннях развіцця і функцыянавання беларускай мовы ў розных сферах ужытку ў XXI ст. Яго выступленні і інтэрв'ю ў значнай ступені садзейнічаюць фарміраванню станоўчага іміджу беларускай мовы ў грамадстве як дзяржаўнай мовы краіны і мовы тытульнай нацыі, фарміруюць паважлівыя адносіны да нашай духоўнай спадчыны і нацыянальнай культуры, мовы і літаратуры.

Узнагароджаны Ганаровымі граматамі Прэзідыума НАН Беларусі, Міністэрства адукацыі і Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь. З'яўляецца лаўрэатам прэміі НАН Беларусі за 2001 (за манаграфію «Словаўтварэнне і граматыка», 2001) і 2011 (у складзе аўтарскага калектыву за цыкл прац «Навуковае і практычнае забеспячэнне ўвядзення ў дзеянне Закона Рэспублікі Беларусь «Аб правілах беларускай арфаграфіі і пунктуацыі») гады.

А. А. Лукашанец карыстаецца заслужанай павагай сярод супрацоўнікаў Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі і мовазнаўцаў усёй краіны. Яго цэняць і паважаюць за высокі прафесіяналізм і адданасць любімай справе, прынцыповасць, аб'ектыўнасць і мэтанакіраванасць, працавітасць і адказнасць, ведаюць як жыццярадаснага, шчырага і адкрытага чалавека з выдатным пачуццём гумару. Навуковая грамадскасць, сябры, калегі, вучні шчыра і сардэчна віншуюць Аляксандра Аляксандравіча з юбілеем і ад усёй душы жадаюць моцнага здароўя, невычарпальнага аптымізму, светлых даляглядаў, новых поспехаў на шчодрай ніве беларускага мовазнаўства.

*І. Л. Капылоў*